***Пятрэнка Наталля Аляксандраўна,***
аспірант Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (Віцебск, Беларусь);
***Космач Веньямін Аркадзьевіч,***
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (Віцебск, Беларусь)

# Асноўныя паказчыкі развіцця камунальнай гаспадаркі і інжынернага абсталявання г. Віцебска ў 1941 і 1944 гг.: параўнальная характарыстыка

Да падзей Вялікай Айчыннай вайны г. Віцебск быў адным з найбольш развітых гарадоў Савецкай Беларусі з дастаткова паспяховай камунальнай гаспадаркай і інжынерным абсталяваннем. За акупацыйны перыяд горад быў амаль поўнасцю зруйнаваны, прадстаўнікі місіі Чырвонага Крыжа лічылі, што горад памёр і няма той моцы, што верне яго да жыцця. Аднак, дзякуючы гераізму жыхароў, горад здолеў адрадзіцца за дастаткова кароткі перыяд! Менавіта таму, для больш дасканалага асэнсавання неверагодных маштабаў пасляваеннага аднаўлення г. Віцебска, неабходна прааналізаваць тыя страты, што былі нанесены акупантамі.

У артыкуле пастаўлена мэта зрабіць параўнальны аналіз даваеннага і пасляваеннага становішча камунальнай гаспадаркі і інжынернага абсталявання г. Віцебска.

У даваенны перыяд у г. Віцебску адбывалася актыўнае будаўніцтва новых прамысловых аб'ектаў, а адпаведна, назіралася павелічэнне насельніцтва, колькасць якога ў 1941 г. складала амаль 200000 жыхароў. Цяжка ў'явіць, што на 26 чэрвеня 1944 г. у горадзе засталося толькі 118 чалавек [1, арк. 2]. Толькі пасля выгнання акупантаў і вяртання людзей на Радзіму колькасць насельніцтва пачне паступова павялічвацца. Згодна з дадзенымі Гарінспектуры на 1 студзеня 1941 г. жыллёвы фонд горада налічваў 20244 дамоў з жылой плошчай 824110 квадратных метраў [2, арк. 10]. У сістэме гарадской камунальнальнай гаспадаркі знаходзілася 564234 квадратных метраў, астатняе ў прыватнай уласнасці [3, арк. 194].

Пасля вызвалення горада ад фашысткіх захопнікаў, жыллёвы фонд страціў 93%: з 824110 квадратных метраў засталося 57600, у тым ліку па камунальнаму фонду 28350 [4, арк. 67]. Згодна з дадзенымі Гарінспектуры стан будынкаў жыллёвага фонду выглядаў наступным чынам: 70,1 % былі поўнасцю знішчаны, 23,5 % патрабавалі капітальнага рэмонту і 6,4 % ацалелі, аднак

патрабавалі бягучага рамонту. Агульная плошча знішчэнняў жыллёвага фонду адпавядала стратам ўласнасці гарсавета на 94,8 %, ведамаснага карыстання на 92,4%, прыватнай маёмасці на 94,8 % [2, арк. 10]. Такім чынам, у горадзе засталося меней 7% жылых памяшканняў, першапачаткова выкарыстоўваліся любыя ацалелыя будынкі і нават зямлянкі.

У даваенны час г. Віцебск меў добраўпарадкаванае цэнтралізаванае водазабеспячэнне. Крыніцамі водазабеспячэння з'яўляліся 2 артэзіянскіх гарызонта, залягаючых у расксолістых вапняках. Мелася 2 групы артэзіянскіх свідрвін і вадаправодных пабудоў: адна ў раёне Пяскавацікa з 7 артсвідравінамі, насосна-кампэсійнай станцыяй, зборным рэзервуарам, другая – у раёне Маркаўшчыны з 3 артсвідравінамі і такімі ж пабудовамі як на Пяскавацiку. Сумарная вытворчасць усіх свідравін складала 25000 кубаметраў вады на суткі [2, арк. 15].

Згодна справаздачам на 1 студзеня 1941 г. вадаправодная сетка мела агульную працягласць каля 60 кіламетраў, у горадзе было 2 воданасосныя станцыі з 2 рэзервуарамі агульнай моцнасцю 13400 кубаметраў вады на суткі, а таксама мясцовая сцёкавая каналізацыя на 12,7 кіламетраў [4, арк. 67]. Акрамя гэтага ў горадзе працавала 90 водаразборных калонак агульнага карыстання, а таксама вялося забяспечванне ўнутрыкватэрных патрэб у колькасці 223000 метраў квадрадтных [3, арк. 194]. У перэферыйных раёнах асаблівую ролю мелі калодзежы з піццявой вадой, якіх у горадзе налічвалася 1581 штука. Аддзел ачысткі налічваў: 170 коней, 2 аўтамашыны-цыстэрны, 4 грузавых аўтамашыны. У горадзе было 5 лазняў на 1200 месцаў і механізаваная пральня, а таксама 81 калодзеж сцёкавых водаў [4, арк. 67].

За перыяд вайны вадаправодная сетка, воданасосныя станцыі і воданапорныя бакі былі поўнасцю зруйнаваныя, абсталяванне было альбо знішчана, альбо вывезена акупантамі. Па сутнасці асноўнымі рэзервуарамі вады, якімі горад карыстаўся пасля вайны, сталі 83 ацалелых калодзежа. Па аддзелу ачысткі зруйнавана і вывезена ўсё. У горадзе засталася толькі адна лазня на 100 месцаў, аднак і тая была на 43% зруйнаваная [4, арк. 67].

У даваенны час г. Віцебск забяспечваўся электраэнергіяй ад гарадской электрастанцыі моцам 2 мегавата і раеннай падстанцыі БелГРЭС. У горадзе было 2 паніжальныя падстанцыі: паўночная і паўднёвая, на 10000 і 5000 кілавольтампер адпаведна. Забеспячэнне

падстаецый адбывалася праз лінію электраперадачы 110 кілавольт працягам 61 кіламетр. Для забеспячэння патрэбаў горад меў 85 трансфарматарных падстанцый з агульным моцам трансфарматараў 21500 кілавольтампер, 46712 метраў падземных высакавольтных кабельных сетак ў 6,6 кілавольт, 23325 метраў высакавольтных паветраных ліній у 6,6 кілавольт в і 120 кіламетрамі нізкавольтных ліній. За перыяд акупацыі ў горадзе зберагліі толькі 120 кіламетраў падземнай высакавольтнай сетцы – усе астатняе абсталяванне было страчана [2, арк. 18].

Асноўную ролю ва ўнутрыгарадскім транспартным руху займалі трамвай і аўтобус. Трамвайныя шляхі дасягалі 32 кіламетраў, у гарадскім карыстанні было 54 трамвайных вагонаў, 96 аўтобусаў, 776 грузавых і 124 легкавыя аўтамашыны [3, арк. 194]. Гаспадарка трамвая мела цягавую падстанцыя моцнасцю 1800 кілават, парк і дэпо з абсталяванем, паветраную кантактную сетку працягам 48 кіламетраў, сетку забеспячэння працягам 21 кіламетр, 2 грузавых маторных вагона, 1 снегачыст, 5 грузапляцовак, а таскама 7 аўтамаашын. За перыяд вайны было страчана ўсё абсталяванне і па сутнасці засталіся толькі трамвайныя шляхі, якія таксама патрабавалі рэмону [4, арк. 67].

У даваенны перыяд у г. Віцебску было 2 моста праз р. Заходняя Дзвіна, 3 праз р. Віцьба і 1 праз р. Лучоса, а таксама 2 чыгуначных моста праз р. Заходняя Дзвіна. Вуліцы горада і плошчы былі замошчаны булыжнікам і асфальтам на 771100 метраў квадратных і 1843 кіламетра заасфальтаваных тратуараў [3, арк. 194]. На 1 студзеня 1941 г. у горадзе працавалі дамбы па вуліцах Фрунзэ, Авіяцыйнай, Крывой і ў раёне Маркаўшчыны. На 26 чэрвеня 1944 г. фактычна ўсе покрыва дарог было знішчана, атрымалася зберагчы толькі 1 мост праз праз р. Заходняя Дзвіна на 209 пагонных метраў і 1 мост праз р. Віцьба на 69 пагонных метраў, часткова дамбы па Авіяцыйнай і Крывой, а таксама ў раёне Маркаўшчны [4, арк. 67].

Па матэрыялах справаздачы горад меў 129,5 гектараў зяленых насаджэнняў, у тым ліку пад паркі культуры і скверы адпачынку было прыстасавана 17,4 гектара [3, арк. 194]. Згодна дадзеным у горадзе было 9 сквераў, 1 бульвар, 1 парк. У гаспадарцы горада зафіксавана: аранжарэй на 4862 метраў кубічных і пітомнік плошчай на 21 гектар, у якіх было 120000 дэкаратыўных дрэваў, 200000 кустоў, 15000 пладовых дрэваў. Пасля акупацыі засталося толькі

каля 30000 дэкаратыўных дрэваў і кустоў, аранжарэі і парнікі былі поўнасцю страчаны [4, арк. 67].

Такім чынам, у даваенны час у горадзе мелася добраўпарадкаванае цэнтралізаванае вода і электразабеспячэнне, развітая транспартная і інжынерная інфраструктура, назіраўся рост прамысловага і жыллёвага будаўніцтва. У цэлым, камунальная гаспадарка г. Віцебска мела станоўчую тэндэнцыю развіцця. За перыяд нямецкай акупацыі горад быў амаль поўнасцю зруйнаваны: зберагласся меней 7% даваенных аб'ектаў жыллёвага фонду, камунальная гаспадарка і інжынернае абсталяванне было ў поўным заняпадзе. Перад кіраўніцтвам горада і прыбываючым насельніцтвам паўстала задача правядзення паскоранымі тэмпамі аднаўленчых мерапрыемстваў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 2784. Воп. 1. Спр. 84.
2. ДАВВ. Ф. 2207. Воп. 2. Спр. 1.
3. ДАВВ. Ф. 2784. Воп. 1. Спр. 1.
4. ДАВВ. Ф. 2207. Воп. 1. Спр. 12.


* * *


***Самотуга Інна Сергіївна,***

студентка 4 курсу Навчально-наукового інституту історії та філософії Сумського державного педагогічного університету імені А.С. Макаренка (Суми, Україна);

***Снагощенко Валентина Володимирівна,***

кандидатка педагогічних наук, доцентка кафедри всесвітньої історії, міжнародних відносин та методики навчання історичних дисциплін Сумського державного педагогічного університету імені А.С. Макаренка (Суми, Україна)


## Польське питання на Паризькій мирній конференції

Протягом тривалого часу польський народ прагнув відновити втрачену державність, мріяв про незалежність. І лише з початком Першої світової війни польське питання почало відігравати значну роль у планах воюючих сторін. Ще більшого значення це питання набуло наприкінці війни. У січні 1919 року країнами-переможницями у Першій світовій війні була скликана Паризька мирна конференція, яка мала важливе значення для подальшого розвитку країн Європи. На ній вирішувалось низка питань: підписання мирних договорів, визначення кордонів країн, визнання